Аднойчы падчас напісання чарговага артыкула па навуковай тэматыцы мне пашчасціла сустрэцца з цудоўным чалавекам — кандыдатам тэхнічных навук старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута механікі металапалімерных сістэм імя У.А.Белага НАН Беларусі Наталляй Вінідзіктавай. Менавіта тады Наталля Сяргееўна расказала мне гісторыю сваёй сям'і, дзе з пакалення ў пакаленне паступаюць на фізічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны, працуюць педагогамі і вучонымі. Вядома, я не магла пакінуць па-за ўвагай нашых чытачоў цудоўную гісторыю дынастыі фізікаў з Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці.

Падрабязней...